***доўгай** і невыразнай* [2, с. 137]; *Студня **глыбокая-глыбачэзная**, і светлая ў ёй вада, і яна – мне здаецца – уздрыгвае, быццам сэрца, і падымаецца да паверхні* [2, с. 269]; *Ды там, дзе нібыта павінна ляжаць салома, красуе ад краю да краю поля **зялёным-зялёная** рунь ...* [2, с. 330].

**Пры аб'яднанні прыслоўяў** у паэтычных творах А. Разанава вызначаюцца наступныя падгрупы:

1) **рэдуплікацыя прыслоўя** з'яўляецца прадуктыўным тыпам словаскладання і ўзмацняе значэнне прыслоўя: ***Ціха-ціха** насустрач, **павольна-павольна** паварочваецца сланечнік* [2, с. 166]; *... хіба вы **нічога-нічога** не ведаеце пра мяне*?! [2, с. 278]; *...калі карыты і ночвы прысвечаны сушы і толькі **час-почас** асвечваюцца вадою, то човен начуе і днюе ў вадзе ...* [2, с. 430];

2) **спалучэнне розных па значэнні прыслоўяў**, напрыклад: *Што ў чалавеку сонца?.. што вада?.. Нас хтосьці падмяняе ... падмяняе... і ўжо без нас **тады-сяды** жыве і нават разважае аб рамёствах* [2, с. 144].

Нечаканае спалучэнне ўзуальных слоў стварае эфект незвычайнасці, адлюстроўвае асаблівасць асацыяцый, непаўторнае багацце свету А. Разанава. З семантычнага боку такія аб'яднанні служаць узмацненню значэнняў, больш поўнаму, featuring рознабаковаму апісанню сітуацыі і стварэнню асаблівага стылістычнага эфекту, з'яўляюцца моцным экспрэсіўным сродкам, характарызуюцца яркай вобразнасцю і эмацыянальнай насычанасцю, перадаюць адпаведны настрой і душэўны стан аўтара.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Оганесян, А. Г.** Окказиональные слова в поэзии С. Кирсанова: словообразовательно-стилистический аспект: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / А. Г. Оганесян; Ин-т языка АН СССР. – Москва, 1989. – 23 с.

2. **Разанаў, А.** Танец з вужакамі: выбранае / А. Разанаў. – Мінск: Мастац. літ., 1999. – 462 с.

УДК 37.091.3:811

***А. В. Шарапава***

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРАЎ ЯНКІ КУПАЛЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ВА ЎСТАНОВАХ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ (ДЫСЦЫПЛІНА «БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА»)

**Анатацыя.** У артыкуле прапануецца сістэма метадычных рэкамендацый па правядзенні заняткаў па тэме «Янка Купала». Падкрэсліваецца значнасць твораў Купалы для дзяцей, фарміраванне ім традыцый беларускай дзіцячай літаратуры, засваенне новых і захаванне традыцыйных тэм, вобразаў, жанравых форм.

**Ключавыя словы**: методыка вывучэння, кампетэнцыі, верш, паэма, фальклор, дзіцячая літаратура.

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская дзіцячая літаратура» прафесіянальнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці 2-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» для рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі (далей – Праграма) арыентуе выкладчыка на фарміраванне сярод іншых такіх кампетэнцый, як «ведаць на ўзроўні разумення <…> выхаваўчае, адукацыйнае і эстэтычнае значэнне дзіцячай літаратуры; жыццё і творчасць беларускіх дзіцячых пісьменнікаў у кантэксце канкрэтнай гістарычнай эпохі; <…> умець аналізаваць творы з улікам іх ідэйна-мастацкай цэласнасці і спецыфікі аўтарскай пазіцыі, актуальнасці, даступнасці і цікавасці для малодшых школьнікаў», а таксама рэцэнзіраваць мастацкі твор, анатаваць кнігу, складаць планы-канспекты ўрокаў, пісаць рэфераты і інш. [3, с. 2–3]. У такім кантэксце важным элементам педагагічнай сістэмы з'яўляецца вывучэнне літаратурнай спадчыны Янкі Купалы, 140-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца ў гэтым годзе. Класік беларускай літаратуры шмат зрабіў для фарміравання каштоўнаснага фундамента беларускай нацыі, таму вывучаць яго літаратурную спадчыну пачынаюць з маленства. Сярод рэкамендаваных твораў для дашкольных устаноў такія вершы Купалы, як «Лістапад», «Хлопчык і лётчык», «Бай» [4]. У пачатковай школе вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» прапануюць для чытання і вывучэння ў класе, а таксама для пазакласнага чытання (выдзелены курсівам) наступныя творы паэта: «Хлопчык і лётчык» (2 клас); «Лістапад», «*Юрачка*», «*Сын і маці*», «*Вясна*», «*Сыны*» (3 клас); «Песня і казка», «*Вясна*», «*Над калыскай*» (4 клас) [2]. Таму абсалютна мэтазгодным з'яўляецца вывучэнне творчасці Купалы ў межах манаграфічнай тэмы, на якую Праграма адводзіць дзве гадзіны (практычныя заняткі).

Пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская дзіцячая літаратура» неабходна выпрацаваць сістэму работы, што прадугледжвае пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў выкананне пэўнага комплексу заданняў, часам апераджальнага характару. Да практычных заняткаў навучэнцам прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання і практыкаванні да іх.

1. *Жыццё і творчасць Янкі Купалы.*

Практыкаванне 1. Самастойна прачытаць біяграфію Купалы па артыкуле з вучэбнага дапаможніка «Беларуская дзіцячая літаратура» [1, с. 67–77].

Практыкаванне 2. Непасрэдна на занятках адбываецца актуалізацыя ведаў праз запаўненне храналагічнай табліцы (у слупку «ДАТА» мэтазгодна запісаць наступныя гады: 1882, 1898, 1908, 1909, 1913, 1915, 1914–1915, 1916, 1922, 1925, 1930, 1942 і інш.). Неабходна звярнуць увагу навучэнцаў на прататыпную аснову многіх купалаўскіх твораў і папрасіць узгадаць іх.

2. *Увага Янкі Купалы да пытанняў развіцця беларускай літаратуры для дзяцей. Публікацыі ў 1920–30-х гг. у дзіцячых часопісах «Зоркі», «Беларускі піянер», «Іскры Ільіча».*

Практыкаванне 1. Апераджальнае заданне для гэтага пытання адносіцца да высокага прадуктыўнага ўзроўню. Адказ на яго можа быць прадстаўлены ў выглядзе праекта. З вучэбнай групы фарміруецца некалькі міні-груп, кожная з якіх прадстаўляе адзін з названых дзіцячых часопісаў. Справаздачу мэтазгодна прадставіць у выглядзе прэзентацый, дзе першы слайд – гэта вокладка згаданага часопіса, а наступныя – вершы, белетрызаваныя «Задачкі» паэта, якія былі ў выданні надрукаваны. Інфармацыю па месцы першай публікацыі тэксту можна знайсці ў зборы твораў Купалы. Такім чынам, будуць удасканальвацца ўменні па візуалізацыі інфармацыі і навыкі пошукавай дзейнасці.

Практыкаванне 2. Найбольш творчым і здольным вучням рэкамендуецца падрыхтаваць і аформіць арыгінальны зборнік з твораў паэта, які можна выкарыстоўваць у дзіцячым чытанні. Узорам могуць быць зборнікі Купалы, прызначаныя для дзяцей, – «Хлопчык і лётчык» (1937), «Для дзяцей» (1940).

3. *Тэма дзяцінства ў паэзіі Янкі Купалы пачатку XX ст. Вобразы дзяцей-сірот. Пазіцыя паэта-гуманіста.*

Практыкаванне 1. У межах названай тэмы Праграмай рэкамендуецца для чытання верш «Над калыскай». Цікава, што такую назву носяць адразу некалькі твораў паэта. Заданнем для навучэнцаў будзе правесці параўнальны аналіз гэтых тэкстаў. Вершы «Над калыскай» («Спі, маленькі мой сыночак!..» (1906)), «Над калыскай» («Люлі, спі, мой сынку!..» (1906–1910)), «Над калыскай» («Калыхала маці сына…» (1919)) напісаны ў розныя гады, таму неабходна вызначыць сувязь паміж ідэйна-тэматычным гучаннем твора і часам, у які яны былі створаны.

Практыкаванне 2. Пры аналізе вершаў пад назвай «Сын і маці» таксама неабходна ўлічваць час і абставіны яго стварэння. Верш 1919 г. мае падзагаловак «Мамка, мамка! Што так плачаш?..». Ён напісаны ў неспрыяльныя для паэта і Беларусі часы грамадска-палітычных катаклізмаў, напоўнены прадчуваннем небяспекі. А верш 1921 г. з падзагалоўкам «Мамка, мамка, нам сягоння…» прасякнуты аптымістычным пафасам, адлюстроўвае фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці хлопчыка, сапраўднага грамадзяніна, які ганарыцца сваёй Радзімай.

Практыкаванне 3. Выкладчык мае магчымасць некалькі пашырыць колькасць тэкстаў. Мэтазгодным будзе прапанаваць двум навучэнцам падрыхтавацца да выразнага чытання вершаў «Сірочая доля», «Песня сіроткі». У канцы дадзенага тэматычнага блока заняткаў праз сістэму пытанняў неабходна падвесці маладых людзей да высновы адносна купалавай гуманістычнай пазіцыі. Ён не проста адлюстроўвае няшчасную долю сірот, дзетак са збяднелых сем’яў, а імкнецца паказаць, што заўсёды трэба шукаць выхад са складанай сітуацыі, старацца стаць добрым чалавекам, сапраўднай асобай. Паспрыяць і падтрымаць

у гэтай сітуацыі можа маці, сябар, нераўнадушны чалавек, прырода, пачуццё гонару за сваю Радзіму, эмпацыйныя адносіны да бліжняга.

4. *Сувязь вершаў Янкі Купалы для дзяцей малодшага школьнага ўзросту з традыцыямі беларускага дзіцячага фальклору. Займальнасць сюжэта, экспрэсіўнасць мовы.*

Практыкаванне 1. Пры разглядзе вершаў Купалы «Бай», «Мароз», «Песня і казка», «Кароль» навучэнцы павінны: 1) вызначыць, з якім жанрам/жанрамі дзіцячага фальклору суадносіцца верш; 2) ахарактарызаваць цэнтральны вобраз/вобразы, назваць (па магчымасці) фальклорны прататып; 3) запісаць у сшытку азначэнне паняцця «персаніфікацыя» (увасабленне); 4) знайсці сродкі мастацкай выразнасці, выкарыстаныя ў вершах, і працытаваць іх; 5) суаднесці вершы з вядомымі творамі для дзяцей айчынных і замежных аўтараў; 6) вызначыць выхаваўчае значэнне твораў і іх этычны і эстэтычны патэнцыял.

Практыкаванне 2. Для фарміравання творчых здольнасцяў навучэнцаў мэтазгодна прапанаваць творчае заданне: перадаць сюжэт вершаў у выглядзе рэкламнага тэксту, інфармацыйнага паста ў сацыяльнай сетцы, міні-рэцэнзіі. Можна ўстанавіць абмежаванне, напрыклад, не больш за 70 слоў у тэксце.

5. *Вершы Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык», «Хлопчык і лётчык на вайне». Мастацкае раскрыццё думак і імкненняў дзяцей.*

Практыкаванне 1. Пры разглядзе гэтага пытання навучэнцы павінны ўзгадаць гісторыю напісання верша «Хлопчык і лётчык», расказаць пра яго папулярнасць і грамадскі рэзананс, а таксама публікацыю твора ў газеце «Правда».

Практыкаванне 2. Навучэнцам прапануецца паразважаць, чаму верш «Хлопчык і лётчык на вайне», які з’яўляецца працягам верша «Хлопчык і лётчык», менш папулярны за свайго папярэдніка. Свае адказы яны павінны аргументаваць прыкладамі з тэкстаў. Важнае значэнне пры супастаўленні вершаў набывае праблема гістарычнай рухомасці сэнсу твора. Маладыя людзі павінны самастойна прыйсці да высновы, што толькі сапраўды высокамастацкі твор застаецца актуальным для многіх пакаленняў чытачоў.

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, франтальная або выбарачная праверка іх выкладчыкам. Для самастойнай работы прапануюцца наступныя пытанні і заданні.

1. *Тэма моладзі ў вершах Янкі Купалы «Алеся», «Сыны», «Арлянятам». Сувязь з фальклорам.*

Заданне 1. Прачытайце вершы, размяркуйце па адным вершы на міні-групу і напішыце разгорнутую рэцэнзію на яго.

Заданне 2. Узгадайце фальклорныя творы, якія адпавядалі б названым вершам у жанравых, матыўных, вобразных аспектах. Напрыклад, у вершы «Алеся» ўзнаўляецца жанр калыханкі і г. д.

2. *Іншыя творы Янкі Купалы ў чытанні школьнікаў (паэмы «Курган», «Магіла льва»).*

Заданне 1. Напішыце анатацыю да названых паэм Купалы.

Заданне 2. Узгадайце, у якіх творах айчынных аўтараў, акрамя «Магілы льва» Купалы, адлюстроўваецца гісторыя заснавання пэўнага населенага пункта.

Для праверкі ведаў навучэнцаў па творчасці Янкі Купалы мэтазгодна выкарыстаць комплекс тэставых заданняў, у якіх на адно пытанне даецца чатыры варыянты адказаў, і неабходна выбраць адзін − правільны − адказ.

1. Вызначце гады жыцця Янкі Купалы: а) 1882−1956; б) 1883−1971; в) **1882−1942**; г) 1912−1995.

2. Назавіце сапраўднае імя і прозвішча пісьменніка: а) **Іван Дамінікавіч Луцэвіч**; б) Зміцер Хведаравіч Жылуновіч; в) Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч; г) Яўген Іванавіч Скурко.

3. Янка Купала меў дыплом толькі адной навучальнай установы: а) Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі; б) Горы-Горацкага каморніцка-агранамічнага вучылішча; в) **Бяларуцкага народнага вучылішча**; г) Мінскага Белпедтэхнікума.

4. Першы верш Янкі Купалы на беларускай мове надрукаваны ў газеце: а) **«Северо-Западный край»**; б) «Наша ніва»; в) «Звязда»; г) «Беларус».

5. Першы зборнік Янкі Купалы называўся: а) «Гусляр»; б) «Вянок»; в) «Шляхам жыцця»; г) **«Жалейка»**.

6. У якім годзе Янку Купалу было прысвоена званне народнага паэта: а) **1905 г.**; б) 1906 г.; в) 1912 г.; г) 1922 г.

7. Які са зборнікаў для дзяцей належыць пяру Янкі Купалы: а) «Астап»; б) «Азбука – вясёлы вулей»; в) «Калінавая рукавічка»; г) **«Хлопчык і лётчык»**.

8. У якім часопісе Янка Купала надрукаваў свае белетрызаваныя «Задачкі»: а) «Лучынка»; б) **«Зоркі»**; в) «Беларускі піянер»; г) «Бярозка».

9. Галоўныя вобразы вершаў Янкі Купалы «Мароз», «Песня і казка» створаны пры дапамозе такога мастацкага тропа, як: а) **персаніфікацыя**; б) літота; в) метанімія; г) гіпербала.

10. У радку «Іду я, сняжысты, ўсясільны …» з верша Янкі Купалы «Мароз» выкарыстоўваецца такі мастацкі троп, як: а) **эпітэт**; б) перыфраза; в) параўнанне; г) сінегдаха.

11. У вершы «Песня і казка» першы радок кожнай няцотнай страфы паўтараецца. Такая стылістычная фігура называецца: а) **анафара**; б) эпіфара; в) кальцо; г) стык.

12. Як у фальклорных творах, так і ў вершы Янкі Купалы «Бай» вобразу Бая адпавядае наступнае апісанне: а) вялізны стары чалавек з белым, як бяроста, тварам, з вялікімі вачыма, у звярынай шкуры; б) **дзед з барадой, які цікава і займальна расказвае казкі**; в) стары чалавек, укрыты водарасцямі і цінай, з зялёнай барадой, доўгімі валасамі; г) стары чалавек у белай вопратцы, з сівой барадой і доўгімі валасамі, які жыў у хаце, сенцах, клеці ці каморы.

13. Што робіць хлопчык з верша Янкі Купалы «Кароль», калі ўяўляе сябе каралём на прасторы: а) сее жыта; б) **пасе статак**; в) ляціць на парашуце; г) косіць травы.

14. Назавіце імя савецкага касманаўта, у якога верш «Хлопчык і лётчык» быў любімым: а) **Юрый Гагарын**; б) Аляксей Лявонаў; в) Пётр Клімук; г) Уладзімір Кавалёнак.

15. Хто з палітычных дзеячаў адлюстраваны ў вершы Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык на вайне»: а) Ленін і Сталін; б) **Сталін і Гітлер**; в) Молатаў і Рыбентроп; г) Чэрчыль і Рузвельт.

16. Матыў якога жанру дзіцячага фальклору разгортваецца ў вершы Янкі Купалы «Алеся»: а) казкі; б) забаўлянкі; в) загадкі; г) **калыханкі**.

17. Колькі сыноў у бацькі з верша Янкі Купалы «Сыны»: а) 3; б) 4; в) 5; г) **6**.

18. Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі паэм Янкі Купалы і імёнамі персанажаў з іх. Выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў. А) «Сон на кургане»; Б) «Бандароўна»; В) «Курган»; Г) «Магіла льва»; 1) пан Патоцкі; 2) князь; 3) Наталька; 4) русалка: а) А2 Б4 В3 Г1; б) А2 Б4 В1 Г3; в) А4 Б1 В3 Г2; г) **А4 Б1 В2 Г3**.

19. У якім горадзе Беларусі знаходзіцца месца, пра якое так піша Янка Купала: «Пры самым месцы, дзе хаваці / Людцы нябожчыкаў нясуць, / Гару з магілкамі відаці – / Яе Машэкавай завуць»: а) у Брэсце; б) у Віцебску; в) у **Магілёве**; г) у Мінску.

20. Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы прысуджаецца за лепшы: а) празаічны твор; б) **паэтычны твор**; в) драматургічны твор; г) дзіцячы твор.

Такім чынам, прапанаваная сістэма вывучэння тэмы «Янка Купала» фарміруе ў будучага педагога вызначаныя Праграмай кампетэнцыі, садзейнічае найбольш поўнаму выяўленню здольнасцяў будучых спецыялістаў, уцягвае ў працэс пазнання ўсіх навучэнцаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэбны дапаможнік / А. М. Макарэвіч [і інш.]; пад агульн. рэд. А. М. Макарэвіча. – Мінск : РІПА, 2016. – С. 67–77.
2. Вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» [Электронны рэсурс] // Учебные предметы. I–IV классы. 2021/2022 – НИО. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2021-2022-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2021-2022/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021.html. – Дата доступу: 10.05.2022.
3. Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская дзіцячая літаратура» прафесіянальнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці 2-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» для рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй / склад. І. Г. Лабёнак. – Мінск : РІПА, 2014. – 46 с.

4. Учебная программа дошкольного образования для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания [Электронный ресурс]. – Режим доступа: up-doshkolnoe-2019-rus-bel.pdf (adu.by). – Дата доступа: 10.05.2022.

УДК 81’367.5:821

***В. М. Шаршнёва***

# АБЗАЦ У СТРУКТУРЫ СУЧАСНАГА МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

**Анатацыя.** У артыкуле ідзе гаворка аб асаблівасцях дэлімітацыі на абзацы сучаснага мастацкага тэксту. Сярод найбольш выразных асаблівасцей характарызуюцца структурныя, сінтаксічныя, стылістычныя і графічныя. Адзначаецца роля абзаца ў фарміраванні індывідуальнага аўтарскага стылю.
**Ключавыя словы**: абзац, абзацаванне, мастацкі тэкст, структурны, сінтаксічны, стылістычны, графічны, індывідуальны стыль.

У межах антрапацэнтрычнай лінгвістыкі мастацкі тэкст займае асаблівае месца, паколькі яго цэласнаць і дэлімітацыя грунтуюцца не на строгай логіцы разважанняў, а на маўленчай дзейнасці аўтара, якая, нягледзячы на наяўнасць сэнсавага ядра, увасабляецца ў пэўнай структуры. У сістэме абагульненых функцыянальных катэгорый тэкст кваліфікуецца як дынамічная камунікацыйная адзінка найвышэйшага ўзроўню [1, с. 17].

Ад таго, наколькі поўна стваральнік тэксту вызначыць мэты і задачы паведамлення, тып маўленчых паводзін, уласныя адносіны да выказанага, поўнасцю залежыць, якое інтэлектуальнае, эмацыянальнае і эстэтычнае ўздзеянне атрымае рэцыпіент, як ён здолее інтэрпрэтаваць – эксплліцытна ці імпліцытна – пададзеную інфармацыю. Любое тэкстаўтварэнне, безумоўна, суправаджаецца інтэртэкстуальнасцю, свядома абмяжоўваецца прынцыпамі стварэння, мэтавай установкай самога тэксту, аднак іменна ў мастацкім стылі найбольш выразна праяўляецца асабістая пазіцыя аўтара, які накіроўвае чытача да ўспрыняцця выказвання.

Суб’ектыўная форма адлюстравання рэчаіснасці і яе экспрэсіўнае асваенне уплываюць на абзацаванне літаратурна-мастацкага тэксту. Захаванне кампазіцыйнай паслядоўнасці ў раскрыцці тэмы, з аднаго боку, і задача павышэння ўздзеяння, з другога боку, прыводзяць да спалучэння аб’ектыўнага і суб’ектыўнага прынцыпаў абзацавання, што ўплывае на лагічнасць пададзенай інфармацыі і прыводзіць да стварэння сэнсавых і стылістычных эфектаў. Аналіз структурных кампанентаў мастацкага тэксту дапамагае высветліць яго змястоўную, функцыянальную і камунікацыйную характарыстыку.

У якасці важных стылеўтваральных і тэкстаўтваральных сродкаў даследчыкі часта называюць абзац, складанае сінтаксічнае цэлае, перыяд, аднак варта заўважыць, што абзацу ўласціва перавага стылеўтваральнай функцыі,